http://edoc.bseu.by

Закон «О прокуратуре Республики Беларусь» с достаточной полнотой определяет компетенцию органов прокуратуры при осуществлении надзора в сфере государственного управления. В своей деятельности они должны строго руководствоваться положениями законодательства и не подменять другие государственные органы. Такая подмена опасна тем, что, во-первых, снижает эффективность усилий прокуратуры по решению своих прямых задач и, во-вторых, влечет вмешательство в деятельность этих органов, затрудняя выполнение ими своих непосредственных функций.

С целью недопущения подобных негативных моментов, закон «О прокуратуре Республики Беларусь» (ч. 3, ст. 27) специально подчеркивает, что проверки исполнения законодательства проводятся на основании сообщений и других данных о нарушениях законности, требующих непосредственного прокурорского реагирования.

***І.В. Грабянчук, канд. гіст. навук***
***Філіял БДЭУ (Бабруйск)***

## АДЛЮСТРАВАННЕ ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ МЯСЦОВАГА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў ЭКСПАЗІЦЫЯХ МУЗЕЯЎ ПРЫ ГУБЕРНСКІХ СТАТЫСТЫЧНЫХ КАМІТЭТАХ (60-90-я гг. XIX ст.)

Распрацоўка прадпрымальніцкіх праектаў звычайна цесна звязана з вывучэннем прадукцыйных сіл той або іншай мясцовасці. Эфектыўнасць гэтай справы можа ўзрасці пры выкарыстанні грунтоўнай базы краязнаўчых звестак, для стварэння якой асаблівае значэнне мае дзейнасць мясцовых музеяў. У некаторых з іх ёсць дастаткова вялікі гістарычны вопыт.

Музеі пры губернскіх статыстычных камітэтах узніклі ў другой палове 60-х гг. XIX г. у Магілёве, Мінску, Віцебску, а таксама Гродне і мелі выразны краязнаўчы накірунак. Напрыклад, у пратаколе пасяджэння Магілёўскага губернскага статыстычнага камітэта ад 15 лістапада 1867 г. сказана, што музей пры ім ствараецца "...дзеля вывучэння сельскагаспадарчай, рамесніцкай і фабрычнай дзейнасці насельніцтва губерні і азнаямлення спажыўцоў з прадметамі мясцовай вытворчасці..." (Могилевские губернские ведомости. – 1867. – 18 ноября. – С. 210). Спачатку ён меў чатыры аддзелы: 1) вырабаў сельскай гаспадаркі, 2) вырабаў "сельскай прамысловасці", 3) рамесніцкіх вырабаў, 4) вырабаў фабрык і заводаў. Пазней былі адкрыты яшчэ аддзелы выкапнёвых багаццяў, заалагічны і гістарычны.

Арганізатары музея асаблівае значэнне надавалі таму, каб ідэя яго стварэння была спачувальна сустрэта мясцовымі вытворцамі, якія з недаверам адносіліся да гэтай справы, разглядаючы яе як чарговую фіскальную акцыю ўладаў, і неахвотна перадавалі ў новы музей узоры сваіх вырабаў. Супрацоўнікі статыстычнага камітэта цярпліва тлумачылі людзям, што збор матэрыялаў для

музея наадварот будзе садзейнічаць больш шырокаму распаўсюджанню звестак аб вытворчасці, павышэнню попыту на тавары і больш лёгкаму іх збыту.

Значных поспехаў у гэтай справе дасягнулі супрацоўнікі музея пры Мінскім губернскім статыстычным камітэце. У ім экспанаваліся саламяныя вырабы з мястэчка Лахва Мазырскага павета, якія "… вылучаліся лёгкасцю і вытанчанасцю работы". Гарбарныя вырабы паступілі з Рэчыцкага, Мінскага, Бабруйскага паветаў (в. Чарняўка) і мястэчка Брагін, а жалезныя – з Аляксандраўскага завода, які знаходзіўся ў Барысаўскім павеце.

Таксама тут меліся разнастайная кераміка, посуд з зялёнага шкла (Пінскі павет), шмат мадэляў гаспадарчых прадметаў, зробленых з дрэва, узоры насення, прадуктаў харчавання. Узоры тканін і пражы перадалі ў музей як сяляне-саматужнікі, так і прамысловыя прадпрыемствы, якія працавалі на тэрыторыі Мінскай губерні (Игнатьев, Р. Г. Музей при Минском губернском статистическом комитете / Р. Г. Игнатьев. // Минские губернские новости. – 1878. – 28 января. – С. 57-58).

Такім чынам, у музеях пры губернскіх статыстычных камітэтах збіраліся цікавыя матэрыялы, якія адлюстроўвалі розныя аспекты краёвага жыцця. Аднак недахоп тэарэтычных ведаў у іх арганізатараў-чыноўнікаў, абмежаванасць матэрыяльных рэсурсаў не дазволілі ім развіцца ў паўнавартасныя публічныя музеі, якімі фармальна яны з'яўляліся. Матэрыяльнае становішча музеяў было нестабільным і звычайна залежала ад фінансавай падтрымкі статыстычных камітэтаў, якая звычайна была вельмі сціплай. З боку прыватных асоб у якасці ахвяраванняў музеі атрымлівалі пераважна розныя экспанаты (часта выпадковыя, без неабходнай інфармацыі аб іх паходжанні). Грашовых сродкаў паступала вельмі мала.

Такое становішча было абумоўлена нізкім ўзроўнем жыцця і адукаванасці большасці жыхароў краю. Тым не менш, нягледзячы на адзначаныя недахопы, музеі пры губернскіх статыстычных камітэтах заснавалі традыцыю ўсебаковага вывучэння мясцовых прадукцыйных сіл, якая працягваецца сучаснымі беларускімі музеямі, што мае важнае значэнне для развіцця эканомікі рэгіянальнага краязнаўства.

***Т.М. Громыко, А.А. Ермашевич***
*Филиал БГЭУ (Бобруйск)*

## СОЦИАЛЬНЫЙ ФЕНОМЕН ФИЗИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ И СПОРТА

«Здоровье не все, но все без здоровья – ничто» (Сократ).

Формирование здорового образа жизни населения является актуальной задачей для многих стран мира. В современных условиях существенно возрастает осознание роли физической культуры как фактора совершенствования природы человека и общества.